STOWARZYSZENIE MUZEUM
I OŚRODEK KULTURY BIAŁORUSKIEJ
W HAJNÓWCE
17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42
tel. (085) 682 28 89
BIBLIOTEKA

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ СУАЙЧЫННІКАЎ ЗА МЕЖАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Голас Радзімы

№ 2 (2456) 11 студзеня 1996 г.

Выдаецца з 1955 г. Цана 1000 рублёў.

"ЗА СВАЁ ЧАЛАВЕЧАЕ І НАРОДНАЕ ПРАВА"



КАЛІНОЎСКІ І БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

Беларуская нацыянальная ідэя, калі яе сфармуляваць у найбольш кароткай і агульнай форме, -- гэта ідэя суверэннасці беларускага народа, самакаштоўнасці яго унікальнага менталітэту і культуры. Ідэя права і абавязку беларусаў -- імкнуцца да такіх сацыяльных і дзяржаўных формаў, якія найлепшым чынам маглі б забяспечыць захаванне і далейшае развіццё нацыі, яе ўклад у скарбніцу ўсяго чалавецтва.

Як і кожная грамадская з'ява, нацыянальная ідэя вымагае пры сваім вывучэнні гістарычнага падыходу. Яна можа відазмяняцца, трансфармавацца ў часе і мець розныя формы і аспекты -- культурніцкія і палітычныя.

Высокія ідэі патрыятызму, служэння бацькаўшчыне, гонару за родную зямлю, побач з канстатацыяй сваёй адметнасці, выказваліся беларусамі на працягу стагоддзяў (Ф.Скарына, М.Гусоўскі, В.Цяпінскі, Л.Сапега, "Прамова Мялешкі", верш Я.Пашкевіча "Польска квітнет лаціною" і інш.). Асабліва важным у гэтых адносінах было XIX стагоддзе -- эпоха кансалідацыі нацый, калі мы выразна бачым на гістарычнай арэне спецыфічна беларускі культурны, а потым і палітычны рух. Лічыцца, што ў сучасных формах беларуская нацыянальная ідэя сфармулявана ў другой палове мінулага стагоддзя -- гаманаўцамі і асабліва выразна Ф.Багушэвічам у знакамітай прадмове да паэтычнага зборніка "Дудка беларуская" (1891).

(Працяг на 6-й стар.).

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ТАЛІНЕ

ЯК РАЗБЛЫТАЦЬ ЖЫЦЦЁВЫ КЛУБОК?

Эстонія сустрэла нас заходнім шыкам падрыхтоўкі да Калядаў і Новага года. Ілюмінацыя, Санта-Клаўсы маленькія і вялікія ў вітрынах і на вуліцах. Навагоднія сувеніры і музычныя цацкі, каля якіх натоўпы дзяцей, льготны распродаж усіх тавараў праходзіць не толькі ў старым горадзе, але і па ўсім Таліне. З 14 снежня ў Эстоніі ўсё робіцца для таго, каб у кожны дом прыйшоў калядны настрой і хоць невялікі падарунак.

Вось у гэты час тут праводзяцца Дні беларускай культуры, чарговае спатканне беларусаў Эстоніі з гасцямі з Беларусі -- фальклорным ансамблем з Мінска. Год таму таксама было спатканне, ідэя правядзення якога належыць Ніне Савінавай -- кіраўніку новага беларускага культурнага цэнтра (гэта была першая рэалізацыя яе даўняй вялікай задумы: паспрабаваць аб'яднаць усіх беларусаў Эстоніі і беларускія суполкі). На жаль, гісторыя беларускіх суполак у Эстоніі, як і ў многіх краінах, не вельмі добрая. Не знаходзяць паміж сабой паразумення, развальваюцца.

Многія тады аднесліся з песімізмам да гэтай ідэі і мелі на тое падставы. Некалькі чалавек браліся за гэтую справу, але з яе нічога не атрымалася. Савінава пачала з арганізацыі новага культурнага цэнтра, які б змог займацца сапраўды карыснымі і важнымі для беларускай дыяспары справамі, ствараць беларускія нядзельныя школы, рабіць перадачу на тэлебачанні, дапамагаць старым людзям, якія з-за візавага рэжыму не могуць трапіць у Беларусь, адкрыць інфармацыйны цэнтр, у які змаглі б звяртацца бізнесмены не толькі эстонскія, але і шведскія, фінскія, наладзіць турыстычны маршрут у Талін. Каб у гэты культ...ы цэнтр мог прыйсці кожн... беларус...

Падтрымалі Савінаву адразу ж многія бізнесмены, эканамісты, інжынеры. Сярод іх нават юрыст, які працуе ў органах правапарадку на высокай пасадзе, -- камісар паліцыі Вячас... Пацэвіч. Вялікую дапам... арганізацыі цэнтра аказала Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына".

На першае спатканне сабралася многа людзей. Зала былога Дома афіцэраў флоту, які перададзены ўладамі Эстоніі пад Рускі культурны цэнтр, была поўная. Тут прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрстваў культуры і замежных спраў Эстоніі, паслы розных краін у Эстоніі, прадстаўнікі армянскай, карэйскай, украінскай, рускай, азербайджанскай і іншых суполак нацыянальных меншасцяў. То быў вельмі цікавы вечар. І пад канец выступлення вядомага беларускага фальклорнага ансамбля "Крупіцкія музыкі" ўсіх прысутных перапаўнялі пачуцці. Адны плакалі ад ра... дасці сустрэчы з даўно забытымі беларускімі песнямі і танцамі, сэрцы другіх былі перапоўнены гордасцю за нашых беларускіх артыстаў, якія пакарылі і эстонцаў, і рускіх, і ўкраінцаў... І доўга яшчэ ўспаміналі гэта свята ў Эстоніі...

Час ляціць хутка. Роўна год прайшоў пасля першага спаткання. Гэта быў час станаўлення новага аб'яднання і выпрабанняў для яе кіраўніка Ніны Савінавай. Ці хопіць у яе сіл, каб быць увесь час наперадзе, ці стане яна тым чалавекам, які зможа павесці за сабой людзей і падыме беларускую справу?

(Заканчэнне на 6-й стар.).

І БЫЛО НАВАГОДНЯЕ СВЯТА

У звычных клопатах, у імклівых падзеях пабеглі дні новага, 1996 года. Усё так, як і было заўсёды. Але першыя дні студзеня -- гэта было свята.

(Фотарэпартаж са свята на 8-й стар.).

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

МАЛЕНЬКІЯ РАДАСЦІ

МЯСА ПТУШКІ ПАТАННЕЕ

Мяркуючы па ўсім, мяса птушкі сёлета... патаннее. Ва ўсякім разе, такія рэкамендацыі -- аб зніжэнні адпускной цаны на птушку -- дадзены "Белптушкапрому" з боку Міністэрства гандлю. Размова ідзе аб невялікай скідцы -- усяго на тысячу рублёў за кілаграм, але для пакупнікоў гэта "выльецца" ў больш істотную суму, паколькі гандлёвым прадпрыемствам рэкамендавана знізіць нацэнку на мяса птушкі пры аптовых закупках на 2 працэнты, пры рознічных -- на 5.

САНАТОРЫЙ ДЛЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Першых адпачывальнікаў прыняў у Баранавічах санаторый-прафілакторый мясцовага аддзялення Беларускай чыгункі, уведзены ў строй напярэдадні Новага года.

Яго будаўніцтва працягвалася пяць гадоў. Пакуль у эксплуатацыю здадзены толькі лячэбны і спальны карпусы, а ўзвядзенне спартзалы і басейнаў яшчэ працягваецца.

На думку медыкаў, новая здраўніца -- адна з лепшых сярод санаторна-прафілактычных устаноў рэспублікі. Акрамя ўсяго іншага тут устаноўлена самая сучасная імпартная апаратура і абсталяванне. Кошт жа пуцёўкі на 24 дні адпачынку складае крыху больш за два мільёны рублёў.

"Сёння я яшчэ раз падкрэсліваю: мы будзем будаваць дэмакратычную, сацыяльна арыентаваную дзяржаву, планамерна ўдасканальваць эканоміку і духоўныя сферы для задавальнення матэрыяльных і культурных патрэбнасцей чалавека. Іншай меры каштоўнасці нашым пераўтварэнням няма!

Для ажыццяўлення планаў у надыходзячым годзе складваюцца спрыяльныя ўмовы: выбраны новы парламент, сфарміраваны апарат выканаўчай і судовай улады на ўсіх узроўнях. Такім чынам, у нас ёсць усе інстытуты дэмакратычнай дзяржавы.

У сувязі з гэтым я звяртаюся да беларускага народа і прапаную аб'явіць 1996 год годам нацыянальнай згоды і стварэння на карысць нашай Радзімы!

Я ведаю пра цяжкасці, якія перажываюць нашы людзі. Абяцаю ў першыя месяцы 1996 года аказаць вам, дарагія суайчыннікі, рэальную дапамогу і падтрымку ў паляпшэнні матэрыяльнага становішча.

Наступны год -- гэта не толькі год надзей і здзяйсненняў. У 1996 годзе споўніцца 10 гадоў з дня аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Наша дзяржава будзе праяўляць клопаты пра ўсіх, хто перажыў гэту бяду. Няхай такое не паўторыцца нідзе на зямлі".

(З навагодняга віншавання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу).

ФЕСТЫВАЛЬ У ВІЦЕБСКУ

YII міжнародны музычны фестываль імя Івана Салерцінскага прайшоў у Віцебску. Яго ўдзельнікі пазнаёміліся з творчасцю Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь, ансамблем "Класік-Авангард", а таксама з вядомым расійскім кампазітарам, прафесарам Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, сынам выдатнага рускага пісьменніка Аляксея Талстога -- Дзмітрыем Талстым. У рамках фестывалю прайшлі сустрэчы і з парыжскім кампазітарам П'ерам Марытонам.

НА ЗДЫМКУ: П'ер МАРЫТОН і Дзмітрый ТАЛСТОЙ (справа).

НЯСВІЖСКІ КАЛЕДЖ

Сваё дзесяцігоддзе адзначыў Нясвіжскі педагагічны каледж. Сюды цяпер могуць паступаць юнакі і дзяўчаты не толькі пасля дзевяці класаў, але і тыя, што скончылі поўны курс сярэдняй школы. На сённяшні дзень тут займаюцца 633 чалавекі. Гэта ў асноўным дзяўчаты з Мінскай вобласці. Выпускнікі каледжа ідуць працаваць настаўнікамі малодшых класаў.

НА ЗДЫМКУ: у старадаўнім будынку размешчана чытальная зала бібліятэкі.

ІМІДЖ ДЗЯРЖАВЫ

СІСТЭМА "СПЕКТР"

У аэрапорце "Мінск-2" напярэдадні новага 1996 года ўведзена ў строй Аўтаматызаваная сістэма кіравання паветраным рухам "Спектр".

У гэтай знамянальнай для беларускіх авіятараў падзеі прыняў удзел Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Высока ацаніўшы карпатлівую работу спецыялістаў, якія ўкаранілі і асвоілі новую сістэму, ён падкрэсліў, што яна з'яўляецца значным укладам у развіццё эканамічнага патэнцыялу рэспублікі і зможа істотна палепшыць імідж нашай маладой дзяржавы. Неба Беларусі -- гэта перакрыжаванне паветраных шляхоў. Нашай паветранай прасторай карыстаецца сёння больш за 200 авіякампаній з 70 дзяржаў свету. Забяспечыць бяспеку палётаў, якаснае абслугоўванне праходжання паветраных суднаў, дазволіць паспяхова ўключыцца ў сучасны міжнародны авіякасмічны комплекс -- у гэтым і ёсць асноўнае прызначэнне новай спецыялізаванай тэхнікі сістэмы "Спектр".

КАНФРАНТАЦЫЯ

ЗАЯВА ДЭПУТАТАЎ

135 дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі трынаццатага склікання выступілі з наступнай заявай:

Як стала вядома дэпутацкім фракцыям і аб'яднанням Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, якія фарміруюцца, са звароту да нас старшыні Канстытуцыйнага суда В.Г.Ціхіні, высокапастаўлены прадстаўнік адміністрацыі Прэзідэнта неафіцыйна звярнуўся да старшыні Канстытуцыйнага суда з патрабаваннем падаць у адстаўку. У адваротным выпадку, было сказана Валерыю Ціхіні, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сам здыме яго з пасады спецыяльным указам.

Факт процізаконнага ціску на Канстытуцыйны суд сведчыць аб тым, што пэўныя сілы ў акружэнні кіраўніка дзяржавы штурхаюць яго на новы віток канфрантацыі з іншымі галінамі ўлады. Такога роду ціск трактуецца артыкулам 126 Канстытуцыі як недапушчальны і цягне адказнасць па закону. Не можа не трывожыць тая акалічнасць, што спробы падобнага ўмяшання мелі месца і раней. Паўнамоцтвы старшыні Канстытуцыйнага суда могуць быць датэрмінова спынены пры наяўнасці адпаведных падстаў толькі Вярхоўным Саветам.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета трынаццатага склікання выказваюць глыбокую заклапочанасць чарговым парушэннем з боку Адміністрацыі Прэзідэнта закладзенага ў Канстытуцыі прынцыпу раздзялення ўладаў. Абвастрэнне выклікае тым большае неўразуменне, што нагнятаецца напярэдадні першага пасяджэння Вярхоўнага Савета новага склікання. Па сутнасці сваёй гэтыя дзеянні аб'ектыўна накіраваны супраць кансалідацыі палітычных сіл і падрываюць асновы супрацоўніцтва, закладзенага ў ходзе нядаўніх перагавораў Прэзідэнта з фракцыямі і аб'яднаннямі дэпутатаў Вярхоўнага Савета.

Дэпутаты выказваюць упэўненасць у тым, што Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка захавае разважлівасць і не пойдзе на крок, які вядзе да дэстабілізацыі сітуацыі. Вярхоўны Савет заклікае ўсе палітычныя сілы дзейнічаць толькі на падставе законаў і Канстытуцыі рэспублікі.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА

ПАМЯЦЬ ПРА З. АЗГУРА

У мэтах увекавечання памяці народнага мастака СССР Героя Сацыялістычнай Працы Заіра Азгура Прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка пастанавіў стварыць на базе былой творчай майстэрні З.Азгура ў доме № 4 па Трактарнаму завулку ў горадзе Мінску мемарыяльны музей З.І.Азгура -- філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Імя З.Азгура будзе прысвоена Сенненскай сярэдняй школе N 1, і на магіле З.Азгура на Маскоўскіх могілках у Мінску будзе ўстаноўлены помнік мастаку.

КЛІМАТ БЕЛАРУСІ

ВЯЛІКАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

Паводле даных члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Логінава, клімат Беларусі характарызуецца "грандыёзным зімовым пацяпленнем", падобнага якому не было за ўсю гісторыю назіранняў надвор'я на тэрыторыі рэспублікі, гэта значыць, ва ўсякім разе, тры стагоддзі.

Якасна гэта праяўляецца ў тым, што ў апошнія сем гадоў сярэдняя тэмпература зімовай пары была на 7 градусаў вышэйшай, чым раней.

Што гэта азначае для энергетыкі! У адказе на пытанне дапамог разабрацца вядучы інжынер Аб'яднанага дыспетчарская ўпраўлення Беларускай энергасістэмы Георгій Хартановіч. Паводле яго звестак, паніжэнне тэмпературы на 10 градусаў супраць нармальнай зімовай, пры якой штосутачна расходуецца каля 60 тысяч тон умоўнага паліва, патрабуе дадатковага расходу 1,5 тысячы тон умоўнага паліва на электраэнергію і столькі ж -- на цяпло. Нескладана падлічыць, што сем цёплых зім запар дазволілі энергетычнай гаспадарцы рэспублікі зэканоміць каля 1 мільёна 323 тысяч тон умоўнага паліва. Гэта якраз адпавядае той колькасці дзяржаўнага рэзерву мазуту, якая патрабуецца для электра- і цэнтралізаванага цеплазабеспячэння рэспублікі на працягу адной зімы. У грашовым выражэнні эканомія склала каля 80 мільёнаў долараў.

НА МІЖНАРОДНЫМ АЛІМПЕ

Для Святланы Багданавай і Мікалая Іванова 1995 год пакінуў светлую старонку: майстры-цырульнікі з Віцебска прынялі ўдзел у міжнародным конкурсе ў Парыжы і занялі дзесятае і пятнаццатае месцы. Гэта не так ужо і блага, бо ў фестывалі-конкурсе моды прычосак "Залатая ружа" прымалі ўдзел 100 лепшых майстроў сваёй прафесіі з 24 краін свету.

НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК

НАРАДЗІЛАСЯ ТРОЙНЯ

Случчане вадзіцель Васіль і бухгалтар Наталля Сыцько з хваляваннем чакалі дзіця. Маці ўжо споўнілася 32 гады. І тут такая радасць. Амаль на Новы год лёс падараваў шчаслівым бацькам трайнят -- дзвюх дзяўчынак і хлопчыка. Як і належыць мужчыну, Арцём нарадзіўся з самай вялікай вагой -- 2 кілаграмы 870 грамаў. Дзяўчынкі Алёна і Алеся важаць адпаведна 2 кілаграмы 200 і 2 кілаграмы 110 грамаў.

У мінулым годзе ў Слуцку нарадзіліся аж тры тройні.

НОВЫ СТАРЫ УНІВЕРМАГ

"УСПЛЕСК АРХІТЭКТУРНАЙ ДУМКІ Ў ЦЭНТРЫ ГОРАДА"





Цэнтральны універмаг "Мінск", або проста ЦУМ, у краіне ведаюць амаль усе. Гэта адно з найстарэйшых і найбуйнейшых гандлёвых прадпрыемстваў Беларусі. У мінулым годзе універмаг адзначыў сваё трыццацігоддзе. Некалі, у часы дэфіцыту, у ім часцей, чым у іншых крамах, можна было набыць фацэтную замежную сукенку ці боты, праўда, згубіўшы пры гэтым гадзіну, дзве ці тры ў вялізнай чарзе. Прыкмета савецкіх часоў -- чарга -- ужо не тыповая ні для ЦУМа, ні для іншых крамаў. Забылася ўжо і само слова "дэфіцыт". Штодзённа ЦУМ наведвае каля 60 тысяч пакупнікоў. Кожны з іх, у залежнасці ад таго, колькі ў яго кішэні грошай, мае магчымасць выбраць нешта для сябе з 20 тысяч назваў тавараў універмага. Дзённая выручка ад рэалізацыі іх складае тут 660 мільёнаў рублёў.

За 30-гадовае існаванне шмат што змянілася ў працы прадпрыемства. Відавочна, што фарміраванне рынкавых адносін у краіне не магло на ім не адбіцца. Пры планавай гаспадарцы кіраўніцтву не трэба было занадта клапаціцца, *дзе знайсці тавар, як яго прадаць*. Міністэрства гандлю замацоўвала за ЦУМам пэўныя прадпрыемствы, а таксама аптовыя базы, і за гэтыя рамкі нельга было выйсці. З аднаго боку, гэта абмяжоўвала дзейнасць прадпрыемства, з другога, забяспечвала ціхае бестурботнае існаванне.

"Сёння ўсё змянілася і ўсё залежыць толькі ад нас саміх і нашай уласнай ініцыятывы", -- гаворыць загадчык аддзела арганізацыі гандлю Ігар Александровіч.-- Мы самі шукаем тавар, вызначаем яго колькасць і асартымент. Мы выбіраем рэчы толькі з сертыфікатам якасці і з улікам попыту пакупнікоў. Нашымі партнёрамі сёння з'яўляюцца 136 вытворчых прадпрыемстваў Беларусі, 7 аптовых баз, 300 іншых фірмаў і кампаній".

Відавочна, што за 30 гадоў як вонкавы выгляд будынка, так і сістэмы жыццезабеспячэння універмага, гандлёвае абсталяванне маральна састарэлі. Больш таго, за гэты тэрмін у паўтара раза павялічылася колькасць супрацоўнікаў, значна пашырыўся асартымент тавараў, якія патрабавалі новай плошчы. Менавіта таму было прынята рашэнне аб рэканструкцыі будынка з павелічэннем колькасці паверхаў. Яна пачалася ў 1990 годзе, і першая чарга яе скончана ў верасні мінулага года. Нават пасля першага этапа гандлёвая зала раўняецца плошчы амаль усяго старога будынка і складае 3 750 квадратных метраў. Будаўніцтва другой паловы ЦУМа плануецца скончыць у 1997 годзе, і супрацоўнікі бачаць яго сапраўдным супермаркетам. У ім плануецца адкрыць вялікую прадуктовую секцыю. Нават цяпер тут можна атрымаць 2[illegible]уг, сярод якіх даведка аб наяўнасці тавараў, пункты абмену валют, майстэрня, у якой можна падагнаць вопратку да патрэбнага памеру. Ва універмагу працуе кафэ, бар, плануецца яшчэ адк[illegible]ь медпункт, цырульню, спартыўну[illegible]лу і г.д.

ЦУМ -- прадпрыемства дзяржаўнае, але ніякай падтрымкі ад дзяржавы не мае. Ён знаходзіцца на поўным гаспадарчым разліку, і заробак яго супрацоўнікаў залежыць ад прыбытку. Калектыў увесь час працуе над павелічэннем тавараабароту, які за мінулы год павялічыўся у 1,5 раза. Рэнтабельнасць складае 4,5 працэнта. Дарэчы, будаўніцтва вядзецца толькі за кошт банкаўскіх крэдытаў і ў[illegible]ых сродкаў прадпрыемства. У вынік[illegible] пасля рэканструкцыі ўся гандлёвая плошча ЦУМа павінна скласці 8,5 тысячы квадратных метраў, а тавараабарот павялічыцца амаль удвая. Ужо цяпер ёсць прапановы на пастаўку тавараў для новай часткі будынка. ЦУМ браў у[illegible] у шэрагу міжнародных кірмашо[illegible], а таму шмат спадзяванняў на пастаўшчыкоў з блізкага і далёкага замежжа.

Аб архітэктурнай вартасці новага будынка ЦУМа ідуць спрэчкі: адным ён падабаецца, іншыя яго не ўспрымаюць. Аўтар інфармацыйнага даведніка "Горадскоп" назваў яго "ўсплёскам архітэктурнай думкі ў цэнтры горада". Тым не менш, арыгінальнасць праекта бясспрэчная, пэўна, іншага такога будынка ў Беларусі няма. Супрацоўнікам універмага ён падабаецца, таму што працаваць у ім стала больш камфортна і зручна. Пакупнікі таксама ім задаволеныя, бо тут пад адным дахам можна набыць літаральна ўсё неабходнае, што значна зберагае іх час. Прыемна ўсё ж назіраць, як савецкі гандаль зрушыў нарэшце з месца і паціху-памалу робіць крок наперад да сусветных стандартаў.

Таіса БАНДАРЭНКА.

НА ЗДЫМКАХ: рэстаўрыраваны будынак ЦУМа (знешні выгляд); у адной з гандлёвых залаў.

Фота Віктара СТАВЕРА.

НАВУКА І ВЫТВОРЧАСЦЬ

ПАЙШЛІ НА ЗАХАД. І З ПОСПЕХАМ

Раней для вытворчасці такога складанага і унікальнага абсталявання па рашэнню партыйнага камітэта і ўрада пабудавалі б завод з шматтысячным персаналам і ўсёй жыццезабяспечваючай інфраструктурай, з абавязковым канструктарскім бюро і "прышпіленымі" да яго пад распрацоўкі па заказах акадэмічнымі і галіновымі інстытутамі. Вялася б уся праца пад кантролем самых высокіх інстанцый.

Але рынак, што нараджаецца, прымусіў зірнуць на праблему па-іншаму. Сказаць -- па-заходняму было б няправільна, паколькі азначала б капіраванне чужых тэхналагічных мадэлей. А было так.

У акадэмічным Фізіка-тэхнічным інстытуце доўгі час займаліся даследаваннямі і распрацоўкай тэхналогіі клінавай пракаткі. Але сувязь навукі з вытворчасцю -- адно з самых слабых месцаў у эканамічным арганізме краіны. І тады група таленавітых распрацоўшчыкаў перайшла пад крыло Беларускага політэхнічнага інстытута (цяпер -- акадэмія), каб вырашыць гэтую вечную праблему. Прыкладна так утварыўся навукова-інжынерны цэнтр "Белтэхналогія". І сёння мала хто ведае, што ў адным з невялікіх карпусоў БДПА размяшчаецца цэнтр прадпрыемства, здольнага выпускаць найноўшыя станы клінавай пракаткі ў неабмежаванай колькасці. Працуе ж тут ўсяго 60 чалавек... Расказвае Уладзімір САДКО, дырэктар НІЦ "Белтэхналогія":

-- Калі мы гаворым пра "неабгрунтаваную колькасць", то маем на ўвазе мінімальныя ці максімальныя патрэбнасці рынку. Колькі трэба -- столькі і зробім. Мы правялі свой маркетынг і высветлілі: патрэбы прадпрыемстваў Беларусі ў нашым абсталяванні складаюць у сярэднім 5-6 станаў у год, Расіі -- да 30. Партфель заказаў у нас вялікі, але бяда ў тым, што як айчыннаму, так і "эсэндэшнаму" спажыўцу няма чым плаціць. Напрыклад, Мінскі мотавелазавод за стан клінавай пракаткі разлічыўся веласіпедамі, якія нам самім давялося і рэалізоўваць.

Калі коратка гаварыць аб узроўні распрацовак "Белтэхналогіі", то яны цалкам канкурэнтаздольныя літаральна па ўсіх параметрах, маюць ноу-хаў. Таму ў сілу абмежаванасці ўнутранага рынку мы звярнулі позірк на Захад. Летась прадалі ў Германію ўжо 6 станаў па 120 тысяч марак. Гэта, вядома, танней за замежныя аналагі: цана на сусветных рынках залежыць ад аўтарытэту фірмы, яе маркі, а нашу фірму там мала хто ведае. Тым не менш, шлях да вядомасці з цяжкасцю, але пракладваецца. Дзеля гэтага пазалетась НІЦ удзельнічаў у Гановерскім кірмашы. Прычым не з праспектамі на століку, а з дэманстрацыяй абсталявання ў дзеянні, з падключэннем да энергакрыніц. Ля стэнда "Белтэхналогіі" ўсе дні тоўпіліся спецыялісты.

І як вынік, у нашай маладой фірмы з'явіліся заходнія заказчыкі, у Германіі знайшоўся партнёр, які пажадаў стаць афіцыйным дыстрыб'ютарам "Белтэхналогіі". Яшчэ адна прыемная прапанова паступіла з Амерыкі, дзе ёсць магчымасць паказаць беларускі стан клінавай пракаткі.

А цяпер -- аб больш празаічных і будзённых рэчах: як фірма "Белтэхналогія" за тры гады здолела выйсці на сусветны рынак? Галоўная ўмова поспеху, безумоўна, -- узровень распрацовак, прычым не на стадыі даследаванняў і праектавання, а ў дзеючых, апрабіраваных узорах. Узровень, які забяспечвае канкурэнтаздольнасць.

Другая ўмова -- вытворчасць. Гэтую праблему вырашылі проста: заключылі ўзаемавыгадныя дагаворы на выраб асноўных вузлоў з прамысловымі прадпрыемствамі. Зборку арганізавалі на сваёй пляцоўцы ў БДПА. І вытворчасць рабочага інструменту таксама -- гэта сэрца стана. Асноўнымі партнёрамі "Белтэхналогіі" сталі Мінскі станкабудаўнічы завод, дзе ёсць магчымасць разгарнуць вялікую вытворчасць станкоў, і Гомельскі завод гідраапаратуры. Знайшлі пастаўшчыкоў электронікі. Паколькі прадпрыемствы цяпер шмат прастойваюць, то былі рады заказам "Белтэхналогіі", тым больш, што фірма плацежаздольная. У Смалявічах НІЦ арганізаваў вытворчасць дэталей -- завод, які дзейнічае як звычайнае прамысловае прадпрыемства і дае прыбытак. А ўсяго над выкананнем заказаў фірмы працуе ўжо 300 чалавек. Можа быць задзейнічана і больш, але тут ужо ўсё залежыць ад магчымасцей рынку "пераварыць" канчатковую прадукцыю.

Маркетынг -- трэцяя ўмова поспеху. Ім у "Белтэхналогіі" пакуль займаюцца сам кіраўнік і яго сакратар.

Калі па просьбе магіляўчан, якія ствараюць свой тэхнапарк, нямецкія спецыялісты пабывалі ў "Белтэхналогіі", яны здзівіліся і сказалі: "Тут і ёсць тэхнапарк. Не варта вам мудрыць".

Васілій РОШЧЫН.

ДЗЁННІК НЕВЯДОМАГА АЎТАРА

ПАДАРОЖЖА Ў СТАРЫ ПЕЦЯРБУРГ

ПЕЦЯРБУРГ існуе больш двух з паловай стагоддзяў. Калі яго аблічча апошняга стагоддзя адлюстравана ў літаратуры, выяўленчым мастацтве і фатаграфіі, то значна менш вядома пра горад на заранку яго існавання.

Нам удалося знайсці малавядомую крыніцу аб ранняй гісторыі Пецярбурга. Гэта брашура, якая называецца (у рускім перакладзе) так: "Дневник пути из Вильно в Петербург его высокой милости господина Сапеги, старосты бобруйского, а ныне фельдмаршала русских войск, и продолжения его пребывания в Петербурге" (без указання месца і года выдання). Ні ў айчыннай, ні ў замежнай літаратуры гэтая брашура не была апісана.

Аўтар дзённіка пакуль невядомы. З тэкста відаць, што ён быў прыдворным упамянутага беларускага вяльможы -- бабруйскага старосты графа Яна Сапегі і суправаджаў яго ў гэтым падарожжы, апісваючы падзеі дзень за днём.

Беларусь і Літва складалі тады Вялікае Княства Літоўскае, што знаходзілася ў вуніі з Польшчай. Мясцовае дваранства Вялікага Княства Літоўскага да таго часу прыкметна апалячылася, чым і тлумачыцца польская мова дзённіка.

Захоўваецца брашура ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу, у аддзеле "Росіка".

Стыль дзённіка хранікёрскі. Дзень за днём аўтар брашуры апісваў месцы, дзе граф і яго світа спыняліся, і называў імёны і тытулы тых асоб, з кім яго гаспадар сустракаўся. У Пецярбургу Ян Сапега знаходзіўся з 19 лютага па 23 сакавіка 1726 года.

Ян Сапега і яго сын Пётр прыехалі ў Расію па запрашэнню "паўдзяржаўнага валадара", саратніка Пятра I, князя Аляксандра Меншыкава. *Меншыкаў кіраваў справамі* Расійскай імперыі ад імя імператрыцы Кацярыны I, якая атрымала ў спадчыну за год да прыезду старосты бабруйскага прастол пасля смерці Пятра I.

Многія гістарычныя асобы акружаны міфамі і легендамі. Да такіх выдумак адносіцца і паходжанне Меншыкава нібыта з гарадскіх нізоў. А. Пушкін, які быў прафесіянальным гісторыкам, у сваёй "Гісторыі Пятра" адзначыў, што "Меншыкаў паходзіў з дваран беларускіх. Ён адшукваў каля Оршы свой радавы маёнтак. Ніколі ён не быў лакеем і не прадаваў подавых пірагоў. Гэта жарт баяр, прыняты гісторыкамі за ісціну".

Князь А. Меншыкаў імкнуўся ўмацаваць свой уплыў у Беларусі, дзе валодаў маёнткамі паблізу Оршы.

Ян Сапега ехаў у Пецярбург па падтрымку, бо ўзначальваў у краіне апазіцыю магнатаў і шляхты каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Аўгусту II Саксонскаму. Імкненне Аўгуста II да абсалютнай улады ў Польска-Літоўскай дзяржаве выклікала непрыязнасць да яго з боку Пятра I і яго пераемніцы Кацярыны I, якія не жадалі ўзнікнення моцнай манархіі па суседству з Расіяй.

Таму ў Сапегу былі зацікаўлены пры пецярбургскім двары. Старосце бабруйскаму аказалі ў Пецярбургу бліскучы прыём. Яму паказвалі самыя цікавыя месцы ў сталіцы і наваколлі.

7 сакавіка 1726 года Сапегу паказвалі кунсткамеру "за пяць вёрст ад Пецярбурга". Аўтар дзённіка падкрэсліваў, што там "достойные удивления видели редкости, которых невозможно каждую описать, некоторые по крайней мере упомяну. А слева представлена статуя с/вященной/ п/амяти/ императора его милости из воска на проволоке, в нормальных размерах частей тела, так совершенно сделанную, что как бы живого в кресле сидящего представляла, каковая в одежду собственную императора П/етра/ В/елико-го/ одета. Таковая же и другая медная в кирасе стоящая сделана. Показывали нам всего живого зародыши" (...).

8 сакавіка Ян Сапега са світай накіраваўся на востраў Котлін. Аўтар "Дзённіка" піша, што на гэтым востраве будаваўся горад Кранштат.

Аўтар дзённіка пісаў: "Сперва тогда посреди моря стоит остров, в длину на версты три, а в ширину на одну тольку, на каковом острове заложенный город Кронштадт строится, и уже немало каменных домов и дворцов там находится, выстроенных достаточно красивым строением, особенно императорский (дворец) над самым морем. На самом же море, за добрую версту от Кронштадта, крепость Кроншлот с особенным старанием и опытом, на такой глубокой воде построенная, между Кроншлотом и Кронштадтом за полверсты находится плотина, наверху в три линии сделанная, на которых пушки обращены к морю. Между этой плотиной и Кронштадтом пристают купеческие корабли, которых и теперь находится больших двадцать, а меньших пятнадцать. От этой плотины другая большая вокруг города к Петербургу сильнейшим способом основана округлой формы с одними от моря воротами, достаточно обширная, потому что в окружности имеет более двух верст. Где в середине стоят вышеупомянутые военные корабли, весьма большие и великолепные, которых в то время 38 находилось. Там же на воде два больших арсенала построены для хранения оборудования для кораблей, также помещение размещения шлюпок и других плавательных средств, принадлежащих кораблям. В конце (плотины) адмиральская резиденция. Там же в углу плотины помещается здание, предназначенное для гауптвахты и кордегардии. На всех тех местах на плотине и около самой крепости может размещаться несколько сот и более всех пушек, направленных на море. Кроме тех, которые находятся на военных судах. Вернувшись его милость в город Кронштадт был приглашен к вице-адмиралу Сиверсу, иноземцу, который там имеет команду над судами и людьми. Пошли тогда в дом упомянутого вице-адмирала, и там нас до ночи принимали. Ночевали в дворце его княжеской милости Меншикова, достаточно великолепном и красивом строением построенном и хорошо обставленном".

Наступны[м] [дн]ём госці адплылі па Фінскаму заліву на Карэльскі перашыек у Дубкі (цяпер прыморская частка Сестрарэцка), "чтобы (увидеть) различные работы из железа, отличающиеся особливым мастерством".

Далей ідзе падрабязнае апісанне Сестрарэцка. Аўтар "Дзённіка" склаў адно з першых у гісторыі а[пісан]не Кранштата і Сестрарэцка, што павыш[ае ка]штоўнасць брашуры.

Меншыкаў збіраўся выдаць за сына Яна Сапегі -- дваццаціпяцігадовага Пятра сваю дачку Марыю (пазней нявесту імператара Пятра II). Але Кацярына I, якой прыглянуўся прыгожы Пётр Сапега, зрабіла яго сваім фаварытам і жаніхом сваёй пляменніцы Соф'і Скаўронскай.

Каб стала больш ясна, з кім збіралася імператрыца ажаніць потым свайго фаварыта, напомнім, што яна была ўраджэнкай цяперашняй Латвіі, а яе бацькі перабраліся туды з Вялікага Княства Літоўскага і былі простымі сялянамі. Выпадак узвышэння Кацярыны I унікальны. Гэта першы і апошні такі выпадак у гісторыі Еўропы нашага тысячагоддзя. Кар'ера Кацярыны I нагадвае казку, у якой сялянская дачка выходзіць замуж за прынца.

Сялянамі доўгі час заставаліся дваццаць шэсць сваякоў Кацярыны I, якіх у 1723--1726 гадах па імператарскаму загаду адшукалі і сабралі ў Латвіі, Літве, Беларусі і на Украіне. Некаторыя з іх слёзна прасілі не забіраць іх пад вартай у чужую краіну, не ведаючы, што іх чакае. В. Міхневіч, які даследаваў гісторыю сямейства Скаўронскіх (пад такім прозвішчам Кацярына I і яе сваякі ўвайшлі ў гісторыю), адзначыў, што частка з іх жыла ў Друі (цяпер Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці). Як вядома, Друя была ўладаннем Сапег. Сапегам іншы раз прыпісвалі клопат аб Скаўронскіх, што жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Пазней нямецкі гісторык XVII стагоддзя Гельбіг падкрэсліў, што "Петр Сапега один из первых магнатов в Польше (Речи Посполитой. -- **В.Г.**) почел за честь жениться на крестьянке, бывшей племянницею русской императрицы".

На Сапег пасыпаўся залаты дождж даброт Кацярыны I. Ян Сапега атрымаў чын фельдмаршала рускай арміі, ордэн Аляксандра Неўскага, яго сын стаў камергерам Кацярыны I і капітанам гвардзейскага Сямёнаўскага палка. Мы ўжо не гаворым аб багатых грашовых падарунках бацьку і сыну Сапегам.

Калі Кацярына I памерла і да ўлады прыйшоў унук Пятра I Пётр II (сын царэвіча Аляксея), Сапегі захавалі сваё становішча. Пётр Сапега ажаніўся з Соф'яй Скаўронскай. Ян Сапега атрымаў пасаду генерал-губернатара Пецярбургскай губерні. Дзяржаўнымі справамі ні бацька, ні сын Сапегі сур'ёзна не займаліся і яшчэ пры жыцці Пятра II паехалі ў Вялікае Княства Літоўскае.

Валянцін ГРЫЦКЕВІЧ.

НЕПРЫКМЕТНАЯ І СТРАШНАЯ ВАЙНА

РЭКВІЕМ КАРЭЛЬСКІХ БАЛОТ

Усе ветэраны, якія засталіся жывымі, успамінаюць, што адзіна надзейным сродкам ад марозу быў спірт. Месца нараджэння славутых франтавых "наркомаўскіх сто грамаў" -- менавіта фінская вайна.

Снайперам, тым увогуле давалі па цэлай бутэльцы. Снайперская дуэль -- паляванне. Паляванне адзін на аднаго двух трэніраваных, падрыхтаваных стралкоў, што патрабавала часта шматгадзіннага ляжання ў снезе без руху.

З фінскімі снайперамі, якія наносілі адчувальны ўрон пяхоце, давялося сутыкнуцца з першых жа дзён ваенных дзеянняў. За любімую манеру весці агонь з дрэваў нашы байцы ахрысцілі іх "зязюлямі". Іншы раз, пачаўшы "кукаваць", такая зязюля прымушала залегчы ў снезе цэлую роту. У савецкай пяхоце знайшліся таёжныя паляўнічыя, якія і прыдумалі эфектыўны спосаб барацьбы з ляснымі снайперамі. На дапамогу прыйшлі сабакі. Пушчаная наперадзе стралковага ланцуга лайка, бясстрашна лавіруючы паміж снежнымі фантанчыкамі куль, упіралася пярэднімі лапамі ў ствол і гучна брахала. Гэта азначала -- наверсе вораг. Сасну тут жа бралі крыж-накрыж два-тры ручныя кулямёты і прашывалі густую крону, не пакідаючы яе насельніку ніякіх шансаў...

3. "І ПЕРШЫ МАРШАЛ У БОЙ НАС ПАВЯДЗЕ..."

Напярэдадні [нов]ага 1940 года Сталін на экстранным ваенным савеце запатрабаваў дабіцца рашучых поспехаў у самы бліжэйшы час. Кожны новы дзень вялых перастрэлак, развел[ка] боем, артылерыйскіх дуэ[ляў] наносіў адчувальны ўрон [п]рэстыжу і аўтарытэту Чырвонай Арміі.

Пачалася тэрміновая перакідка дывізій з унутраных акруг -- Беларускай, Кіеўскай, Харкаўскай. Апранутыя ў шынялі маршавыя роты ў аўральным парадку грузілі ў цяплушкі, туманна абяцаючы "з зімнім забеспячэннем разабрацца на месцы". Аднак на месцы, як правіла, было ўжо не да таго: жорны вайны патрабавалі ўсё больш і больш чалавечага матэрыялу.

У студзені 1940 года ў гарніла вайны былі кінуты батальёны 2-й, 5-й і 82-й стралковых дывізій, эскадроны 2-й і 3-й кавалерыйскіх дывізій Беларускай Асобай ваеннай акругі. У ходзе баявых дзеянняў асабовы склад, што выбываў, замяняўся ў сярэднім 2--3 разы.

Пасля Новага года актыўныя баявыя дзеянні аднавіліся. Натуральна, адразу ж узраслі страты. І як! Палявыя шпіталі не спраўляліся з патокам раненых. На дапамогу прыйшоў Ленінград, праўда, неўзабаве і ён таксама быў захліснуты гэтым патокам. Тады раненых сталі вывозіць у акруговыя шпіталі. Многа нашых землякоў апынулася зімой 1940 года ў 432-м шпіталі Беларускай Асобай акругі, хаця, натуральна, гэта не афішавалася ў той час па вядомых прычынах.

Цяжкія страты неслі і фіны. Гора ў тысячах казённых канвертаў разляталася далёка па абодва бакі ад лініі фронту. Тысячы "пахавальных" атрымалі і беларускія сем'і. А якімі палітычнымі дывідэндамі можна вымераць гора маці, якая страціла адзінага сына?!

Галоўнакамандуючы фінскай арміяй маршал Карл Густаў Манергейм быў цвярозым і спакойным чалавекам. Будучы перакананым антыкамуністам, ён ніколі не апускаўся да пяшчэрнага нацыяналізму, да нянавісці да рускіх як да народа. Магчыма, гэтая якасць выпрацавалася ў ім за доўгія гады, праведзеныя на расійскай ваеннай службе. Фінскі барон быў не апошняй фігурай у колах царскага генералітэту. Ён даслужыўся да генерал-лейтэнанта, камандаваў адной з лепшых у рускай арміі кавалерыйскіх дывізій. Відаць, дзякуючы сваёй адданасці і стараннасці Манергейм быў заўважаны імператарам Мікалаем і набліжаны да двара. Ён не належаў да таго тыпу людзей, якія ў залежнасці ад палітычнай кан'юнктуры мянялі свае прыхільнасці, як пальчаткі: на працягу ўсёй "зімняй" вайны на стале галоўнакамандуючага ў яго стаўцы ў Мікелі прастаяла фатаграфія з даравальным надпісам і прыпіскай, зробленай рукой маршала: "Это мой государь".

Манергейм выдатна ведаў рускага салдата: яго самаахвярную стойкасць у абароне, узаемавыручку ў баі, нястрымны напор і адвагу ў наступленні. І галоўным контраргументам гэтаму ён выставіў тую магутную сістэму фартыфікацыйных збудаванняў на Карэльскім перашыйку, якая атрымала яго імя.

Што ж уяўляла сабой гэтая "фінская крэпасць"? Звернемся зноў да ўспамінаў удзельнікаў тых баёў. На подступах да першай лініі былі шматлікія дзоты, засекі, завалы, мінныя палі. Фіны ўзарвалі практычна ўсе масты праз камяністыя лясныя рэкі і вузкія гарлавіны азёраў. Інжынернае ўзмацненне ў спалучэнні з балотамі, вузкімі дэфіле азёраў рабілі гэтую мясцовасць цяжкапраходнай для наступаючых.

Кожны вузел супраціўлення абараняўся палявой і казематнай артылерыяй і пяхотай сілай да двух егерскіх батальёнаў. Звычайна вузел уяўляў сабой няправільны прамавугольнік у чатыры кіламетры па фронту і два кіламетры ўглыбіню. Ён налічваў да 30 даўгачасных агнявых кропак (дотаў), што складалі яго бетонны шкілет. Прамежкі паміж дотамі былі запоўнены разгалінаванай сеткай траншэй, акопаў і хадоў зносін, прыкрытых зноў жа засекамі, лянымі завaламі, процітанкавымі "воўчымі ямамі" і складанай сістэмай інжынерных загарод.

Напрыклад, адзін з дотаў у паласе наступлення 100-й стралковай дывізіі меў перад фронтам 45 радоў калючага дроту. "Непасрэдна ў гэтым драцяным полі, -- успамінае ветэран дывізіі В. Коркаў, -- было раскідана ў шахматным парадку дванаццаць радоў процітанкавых бетонных надаўбняў. Акрамя таго, там былі сотні процітанкавых і проціпяхотных мін. Кожны дот меў баявыя казематы, арсенал, калідоры са спускамі ў казарму, электрастанцыю, машыннае аддзяленне, афіцэрскі пакой, кухню, прыбіральню, лазы ў бранякупал. Доты былі разлічаны на прамое пападанне гаўбічных снарадаў".

І гэта яшчэ не ўсё. Адсечныя пазіцыі, што ішлі ў тыл, праз пяць кіламетраў злучалі галоўную паласу абароны з паласой тактычных рэзерваў, ці другой абарончай паласой. Яна мела 39 дотаў і 178 дзотаў з той жа самай сістэмай палявога запаўнення.

Яшчэ прыкладна праз 7 кіламетраў ляжала трэцяя лінія абароны, што складалася з чатырох вузлоў супраціўлення.

І, нарэшце, у непрыступную крэпасць быў ператвораны Віпуры (Выбарг). Фіны фактычна зрабілі з яго асабліва магутны ўмацаваны раён. Апорнымі пунктамі сталі дамы, могілкі, іпадром. У выпадку асобай неабходнасці абарона ўзмацнялася затапленнем тэрыторый на ўсход ад яго шляхам узрыву плаціны Саймаанскага канала.

Прадугледжана было, здавалася, усё, аж да мініравання льдоў Выбаргскага заліва. І ўсё-такі лінію Манергейма прарвалі!..

Ігар КУЗНЯЦОЎ.

Працяг.
Пачатак у № № 50 — 1 (1996 год).

Сяргей ПЯСЕЦКІ

"КАХАНАК ВЯЛІКАЙ МЯДЗВЕДЗІЦЫ"



Праз тыдзень, у нядзелю, мяне адведаў Шчур. Не чакаў яго. Увайшоў у хату, калі мы абедалі. З сабой меў ладны пакунак. Паклаў яго на лаву каля сьцяны, потым скінуў шапку з галавы і пачаў казаць, паціраючы далоні:

-- А я так сьпяшаўся, так сьпяшаўся! Думаю сабе: пасьпею на абед ці не?.. Я до лыхы і до міхы едыны![1] У мяне ж так: да работы -- кажух апранаю, а есьці -- кашулю скідаю!

На тварах прысутных бачу ўсьмешкі: што за такі весяльчак? А Шчур вітаецца са мной і з прысутнымі, пачынаючы ад гаспадара. Усе зразумелі, што гэта мой сябра. Гаспадар запрашае за стол. Шчур сядае ля мяне і кажа далей:

-- Я такі, як мала хто, на яду слых маю: што ні дай -- усё зайграю! Струблю як гляну: капусту дык капусту -- абы тлусту! Гарох -- наемся так, што -- ох! ох!

Усе ўсьміхаюцца. Мацей кажа дачцэ:

-- Насьця, прынясі госьцю міску і лыжку!

Шчур зьвяртаецца да Насьці, якая выходзіць з-за стала:

-- Панна Насьця! Але прыкіньце, каб місачка і лыжачка былі як трэба! У мяне, гаспадар, так: заўсёды жадаю зьесьці чаго-небудзь добрага і... шмат! А вашу капусту я ўжо ў Душкаве зьнюхаў. Бег так, што боты амаль не згубіў.

Пры ядзе ў Даўрыльчукоў звычайна пануе цішыня. Зараз жа зьявіўся нязвыклы рух, які выклікаў толькі сам Шчур. Еў і гаварыў, еў і гаварыў. Нахіляўся то ўправа, то ўлева, блішчэў вачыма і жартаваў. Усіх зачапіў... Бачу вясёлыя твары. Разьлягаюцца ўсё мацнейшыя выбухі сьмеху. Я прыглядаюся да Шчура і не пазнаю яго. Звычайна размаўляе мала. Зь сябрамі ўедлівы, задзірысты. Са мной прыстойны, зычлівы, але скупы на жарты. А тут кіпіць удаваным рухам і жыцьцём. Хоча разьвесяліць нас, і гэта яму ўдаецца напоўніцу.

У пакоі была балалайка, на якой хлопцы і дзяўчаты час ад часу штосьці сабе падыгрывалі. Вечарам, калі ўся сям'я сабралася ў камплекце, бо найважнейшыя справы па гаспадарцы былі скончаны, Шчур настроіў балалайку і пачаў іграць. Іграў добра, і ўсе са зьдзіўленьнем слухалі яго. Ня думалі, каб на гэтай брэнкале можна было так прыгожа іграць. А Шчур сёк кавалак за кавалкам. Тое, што ня мог выціснуць зь інструмента, дарабляў мімікай, рухамі рук і цела. Пачаў, акампануючы сабе на балалайцы, сьпяваць па-беларуску:

Дзяўчыненька, сэрца мое,
Як прыемна ліца твое!
Не так ліца, як ты сама,
І ў паперах упісана.

Шчур, зіркаючы салодкімі вачыма на дзяўчат, сьпяваў далей:

Як я сяджу каля цебе,
Дык жа ж мысьлю,
што я ў небе!
Як я цебе пацалую,
Тры дні ў губе цукар чую!

Дзяўчаты пырскаюць сьмехам, штурхаюцца лакцямі, Шчур з пачуцьцём сьпявае далей. Сьпявае песьню за песьняй, іграе полькі, вальсы, маршы і нейкія ўласныя імправізацыі. Ня думаў, што зь яго такі артыст. Цэлы дзень забаўляў нас усіх, а вечарам, пасьля яды, пачаў зьбірацца ў дарогу.

Мацей запрашаў Шчура, каб прыходзіў, калі будзе мець вольны час. Я пайшоў праводзіць яго. Па дарозе расказваў мне мястэчковыя навіны. Непадалёку ад лесу затрымаўся. З паўгадзіны яшчэ размаўлялі і курылі папяросы. У нейкі момант Шчур міргануў мне вокам:

-- А паненкі там у цябе клёвыя! Дзеўкі як печы!

-- Так, так...

-- Ты падваліся да якой. Будзе табе весялей.

-- Неяк не да таго...

-- Дык зрабі, каб было таго... Дзяўчаты аж пішчаць. Гараць. Ногі заціскаюць, а ты глядзіш. Падумаюць, што калека!

Хутка разьвіталіся, і Шчур, сьпяшаючыся, пайшоў па дарозе, што вяла на тракт, а я вярнуўся на хутар. Застаў усіх за сталом. Доўга яшчэ размаўлялі і сьмяяліся, прыгадваючы жарты і апавяданьні Шчура.

Адзін з братоў узяў у рукі балалайку і пачаў іграць на ёй. Аднак у яго руках інструмент зноў стаў паспалітым брынкалам.

Словы Шчура пра дзяўчат абудзілі ў мяне да іх цікавасьць. Пачаў уважлівей і інакш, чым раней, сачыць за імі. Штораз больш падабаюцца мне. Маюць ладныя, карыя вочы, бялкі якіх аддаюць сінявой, зацяняюць іх густыя доўгія павейкі. Вусны малыя, выразныя, шчокі ружовыя, зубы выдатныя. І павінны быць цудоўна збудаваныя. З усё большай зацікаўленасьцю аглядаю дзяўчат. Яны адчуваюць гэта. Заўважыў у іх пэўнае какецтва: хочуць мне спадабацца. Але як яны падобныя! Нават розьніца ва ўзросьце сьціраецца.

У той вечар мы пайшлі спаць досыць позна.

Мне прысьніліся "ванькі-встанькі". Яны мелі карыя вочы зь сіняватым адлівам бялкоў. Сьмешна нахіляліся і рухалі вуснамі.

3

Надышлі Каляды. Сьвята сустрэлі ўрачыста, згодна з даўняй традыцыяй. Было і сена пад абрусам, і "куцьця" пад абразамі, і 12 посных страў. Усё было смачнае, і ўсё трэба было пакаштаваць, і я так наеўся, што ўвечары ледзьве выбраўся з-за стала. Ноччу дзяўчына не прыйшла, хоць уначы доўга чуўся шэпт за перагародкай. Магчыма, нешта перашкаджала, альбо не захацела рабіць гэтага сьвятам.

Раніцай усе, апроч мяне і Сымона, які моцна застудзіўся ў перадсьвяточнай лазьні і зараз лячыўся на печы, паехалі на набажэнства не ў Волменскі парафіяльны касьцёл, а ў Ракаў. Дахаты вярнуліся ў дзьве гадзіны дня. Расказалі шмат навін і перадалі мне віншаваньні ад Лорда і Шчура, якія абяцалі наведацца заўтра.

Вечарам накрылі багаты стол. Гарэлкі не шкадавалі, і ўсе добра падпілі... нават дзяўчаты. Седзячы ў радочак на лаве і лускаючы арэхі, яны весела размаўлялі са мной, з братамі і з усімі. Гарэлка падфарбавала ім шчокі, запаліла ў вачах новыя агеньчыкі, выклікала вясёлыя выбухі сьмеху. Я бяру балалайку і пачынаю іграць. Захмялеў ад выпіўкі і зусім іншых, чым звычайна, поглядаў, якія пацiху кідаюць на мяне дзяўчаты. Потым, калі гасьне лямпа, я зь нецярплівасьцю чакаю прыходу каханкі. Шкада, што сам не магу пайсьці да яе. Не чакаў бы так доўга! Браты размаўляюць на палацях. Зрэдку да іх адгукаецца зь печы хворы Сымон. А дзяўчаты доўга паціху размаўляюць. Чую вясёлы сьмех і воклічы. Нарэшце ўсе супакоіліся. Браты храпуць. Кашаль Мацея спыняецца. Перастаюць размаўляць дзяўчаты. А яшчэ праз гадзіну чую лёгкі шэпт. Пасьля адрозьніваю крокі босых ног... Моцна абдымаю і прытуляю да сябе разагрэтае ядранае і зграбнае цела дзяўчыны. У забыцьці цалую яе вусны, твар, шыю.

-- Якая ты цудоўная! Выдатная! -- шапчу ў вуха.

Кладзе мне пальцы на вусны і, здаецца, бязгучна сьмяецца, а затым зь нечаканай сілай і напалам адказвае на мае ласкі.

Назаўтра а 10-й раніцы прыйшлі Лорд і Шчур. Расказалі мне шмат навін і прынесьлі два пакункі з мноствам смачных для нас рэчаў. Выклікалі вялікае ажыўленьне. Мы значна павесялелі.

Пачаўшы ад старэйшых, Лорд вітаўся з усімі, а Шчур выказваў жартаўлівыя пажаданьні. Вітаючыся з дзяўчатамі, ён [illegible]ў выгляд, што цалуе ім [illegible], а на самай справе датыкаўся вуснамі да сваёй далані. Адной ён зычыў вясёлага сну, другой крэпкага храпака, трэцяй -- лёгкага сапеньня, чацвёртай -- моцнага чыху.

[illegible]яўчаты весела [illegible]іхаюцца, зрэдку дасьціпна адказваюць на зачэпкі. Сёньня сёстры апрануліся вельмі старанна: у новыя, каляровыя сукенкі, вышываныя станікі, у боцікі на высокіх абцасах, на нагах белыя панчохі. У косы пазапляталі каляровыя стужкі, на шыю навесілі шмат караляў. Ад іх пахне парфумай і памадай. Шчур падыходзіць да Насьці, прынюхваецца, чыхае і кажа:

-- Вось бы такую жоначку мець... І тытуню ня трэба!

Лорд размаўляе з Мацеем і братамі, а пасьля далучаецца да нас і пачынае гутаркай, жартамі забаўляць дзяўчат. У нейкі момант Шчур набліжаецца да Касі і, ушчыкнуўшы яе за бядро, пытае:

-- А колькі панна Касюхна плаціла за тавар?

Дзяўчына дае яму такога штурхаля, што той адлятае на сярэдзіну хаты.

-- Мудра! -- адгукаецца Лорд.

А Шчур, зрабіўшы перапалоханы выгляд, вымавіў:

-- Калі б уласнымі вачыма ня бачыў, што вось гэтая далікатная ручка панны Касі ды так урэзала, то заклаўся б, што гэта конь мяне ўбрыкнуў. Ну і ну! Ёсьць у паненкі пар у ручках! Цікава, а як жа ў ножках?

-- І ў ножках паньне Касі не забракне! Хочаш паспытаць? -- кажа Лорд.

Адсоўваючыся, Шчур вымаўляе:

-- Ня буду рызыкаваць!

Пасьля абеду мы бяром трое санак і накіроўваемся да бліжэйшай горкі. Пачынаем катацца. Стаіць моцны мароз. Сьнег зіхаціць на сонцы і рыпіць пад нагамі. Санкі хутка нясуцца з гары. Вецер сьпявае ў нашых вушах. Часам санкі перакульваюцца, і тады мы вывальваемся ў сьнежныя гурбы.

У дзяўчат адны санкі на ўсіх, і яны па дзьве ці ўтрох зьязджаюць з гары. Некалькі разоў спрабуем іх дагнаць, аднак яны ўцякаюць. Раз, калі дзяўчаты, усеўшыся, хацелі зьязджаць, паміж Аленай і Магдай уціснуўся Шчур. Дзяўчаты напхалі яму за каўнер сьнегу і, перакуліўшы санкі, вымусілі Шчура ратавацца ўцёкамі.

Забава цягнулася да самага вечара. У пэўны момант, калі Кася зьбіралася зьязджаць, я вырашыў зрабіць тое самае і выхапіў з-пад яе санкі. Кася кінулася адбіраць. Мы пачалі дужацца. Спачатку жартам, а затым усур'ёз. Падахвочваючы нас да барацьбы, усе пасталі вакол.

-- Ну, ну, не паддавайся, Кася! -- крычыць Лорд.

-- Глядзі, Уладак, каб не сьпіхнула з гары! -- чую голас Шчура.

А мы змагаемся зацята, аднак безвынікова. Кася была мацнейшая і нашмат цяжэйшая за мяне. Аднак я быў больш спрытны, хоць і яна таксама некалькі разоў выкруцілася з маіх рук. Нарэшце абое зваліліся ў гурбу. Усе зарагаталі. Я ўсхапіўся на ногі і кінуўся да санак, за якія мы пачалі б[illegible]ьбу. Я ўскочыў і панёсься [illegible]ары. Аднак у апошнюю хвіліну Кася пасьпела ўхапіцца і ўзьлезла ззаду. Мы імчымся ўніз. Вецер астуджвае твары. Зьвяртаюся да дзяўчыны:

-- Кася, гэта ты?

-- Што? -- пытаецца

-- Ну, ня ведаеш, ці [illegible]

Яе твар палымнее. Вочы весела сьмяюцца.

-- Ня ведаю...

Больш не пытаюся. Баюся, каб не атрымалася памылка. Ужо мы ўнізе. За намі зьязджаюць Лорд, Базыль і Шчур, за імі -- Алена, Магда і Насьця.

Позна ўвечары мы ўсе весела вяртаемся дахаты. Сьмех не сьціхае. Шчур, падышоўшы да мяне, мацае бакі.

-- Чаго хочаш?

-- Хачу паглядзець, ці засталіся цэлыя рэбры. З Касяй, браце, ня жарты!

На стале нас чакае багатая сьвяточная вячэра. Мы з апетытам ядзім і шмат пьём. А пасьля вячэры забава цягнецца зноў.

Шчур грае на балалайцы і сьпявае:

Закладай жа пару коні
І пояс шырокі!
Мы паедзем у залёты
Да панны Сарокі...

Пасьля Шчур просіць, каб я зайграў вальс. Бяру балалайку і выконваю просьбу сябра. З камічнай грацыяй Шчур па чарзе абыходзіць дзяўчат і запрашае іх танцаваць, аднак ніхто не ўмее вальса. Тады Шчур танцуе разам з Лордам. Робіць смешныя рухі, крывіць твар і выклікае агульны сьмех. Потым я для іх жа выконваю польку, а яны танцуюць яшчэ сьмяшней. Нарэшце Шчур прыносіць зь сеняў венік і танцуе разам зь ім. Да сваёй дамы спачатку адносіцца вельмі галантна, але калі тэмп полькі ўзмацняецца, ён сам і партнёрша робяць вар'яцкія рухі. Штохвілі хату трасуць моцныя выбухі сьмеху.

У нейкую хвіліну Мацей кажа Шчуру:

-- А можа, хлопча, зайграеш "Лявоніху"?

Шчур ляпае сябе па лбе ў знак таго, што забыўся пра гэты танец. Бярэ балалайку. Па хаце разьлятаюцца вясёлыя гукі танца. Лорд запрашае Алену. Я танцую з Магдай. Кася і Насьця з братамі. Мы ўтварылі некалькі пар.

Пасьля Шчур зайграў другі беларускі народны танец -- "Мяцеліцу". Тэмп рабіўся ўсё жвавейшы, і хата заходзіла ў мяне перад вачыма. У паветры ляталі каляровыя сукенкі дзяўчат. Усіх паланіла вясёлая імпэтная "Мяцеліца". Зьзяюць вочы, зіхацяць твары, ногі ледзь пасьпяваюць за шалёным рытмам танца. У паветры нясуцца воклічы Шчура і Лорда. Танец уздымае усіх, нават Шчур танцуе на месцы разам з балалайкай, на якой грае з усё большым запалам. "Мяцеліца" захапіла нас і круціць, і віруе, і мяце, нібы сапраўдная сьнежная завіруха.

Забава працягвалася доўга, і толькі позна ўвечары ўсе разышліся адпачываць. Шчур і Лорд засталіся нанач. Для гасьцей ссунулі дзьве лавы і зрабілі адзін супольны ложак.

Цішыня яшчэ ня хутка ўсталявалася ў хаце. Доўга па розных кутках гучалі размовы і сьмех. Гэтую ноч я спаў адзін. Мая каханка не наведалася ў госьці. Магчыма, пабаялася, каб не заўважылі мае сябры.

Нараніцу, адразу пасьля сьняданьня, Шчур і Лорд вырушылі назад. Даўрыльчукі ўгаворвалі іх, каб яшчэ пагулялі адзін дзень, але хлопцы адказалі, што сёньня ім абавязкова трэба вярнуцца ў мястэчка і рыхтавацца ў дарогу.

Я пайшоў іх праводзіць. Даведаўся шмат новага. Юрлін перастаў хадзіць за граніцу. Ён добра зарабіў у "залаты сезон" і зараз ня хоча рызыкаваць. Вырашыў дачакацца прыдатнейшай пары. Яго месца заняў Лорд і, як машыніст, водзіць групу на пункт Юрліна. Перад сьвятамі ў мястэчка вярнуўся Цьвік, які восеньню 1922 года паклаў сваю групу ў Саветах. Ён уцёк з высылкі і, змучаны, хворы, ледзьве жывы, дабраўся дахаты. Анёл трапіў у рукі польскіх стражнікаў і зараз сядзіць у навагрудскай турме. Цяпер "дзікіх" водзіць Сум. Група "дзікіх" зьменшылася -- налічвае ад 10 да 15 чалавек. У пачатку зімы "дзікія" зрабілі Кентаўру дзьве агранды, але зараз некалькі партый перакінулі чыста. Браты Алінчукі ў дарогу ня ходзяць -- нечага баяцца. Пятрусь Філосаф хоча адаслаць Юліка Вар'ята ў шпіталь, можа, там яго падлечаць. Хлопцы зрабілі складчыну і сабралі на лячэньне Юліку больш за 400 рублёў. Пачуўшы гэта, я напісаў Петрусю, каб з маіх 1 200 даляраў узяў для Юліка на лекаваньне 100 даляраў, а калі спатрэбіцца больш -- няхай паведаміць мне. Болек Камета п'е, як і раней. Мамант, Алігант і Фэлік Маруда ходзяць за граніцу разам з групай Лорда. Зь імі таксама фартуе Ванька Бальшавік. Шчур сказаў, што Юрлін нібыта перапыніў працу праз Соньку, якую падазрае ў здрадзе: у дарозе ёй і Ваньку здаралася шмат момантаў, якія заўсёды выкарыстоўвалі ў сваіх інтарэсах. Бэлка разам з бабскай (Лорд сказаў -- дзюравай) групай, добра зарабіўшы ў залаты сезон, таксама за граніцу ня ходзіць.

Сябры расказалі яшчэ шмат навін пра граніцу, пра паўстанцаў, пра жыцьцё ў мястэчку, але ні слоўкам не абмовіліся пра Фэлю. Нарэшце запытаўся пра яе ў Лорда.

-- Зараз у Фэлі жыве сваячка з-пад Дуброў, -- адказаў Лорд. -- Альфрэд пасылаў да яе сватоў і зноў зьеў гарбуз. Фэля стала паненкай з пасагам. Ходзіць пра 30 000 даляраў чыстымі! Гараць да яе ўсе, але круціць носам. Мусіць, чакае каралевіча!

Я правёў хлопцаў амаль да Душкава. Калі разьвіталіся, Лорд запытаўся:

-- Ну, крыху звык?.. Не абрыдла табе?

Шчур адгукнуўся да яго:

-- Што яму абрыдзіць! Шамкі і гарэлкі пад дастаткам, а дзеўкі як лані! Мёртвы б падняўся!

-- Я не ляту на іх, -- з удаванай абыякавасьцю адказаў ім. -- А пацехі ў нас ніякай няма. Вось вы толькі трошачкі разварушылі... Сяджу там, бо мушу!

---

[1] Я да піцьця і да ежы аднолькавы (укр.) (Заўвага перакладчыка).

Працяг.
Пачатак у №№ 29—1 (1996 год).

ЯК РАЗБЛЫТАЦЬ ЖЫЦЦЁВЫ КЛУБОК?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Многіх хвалявала гэтае пытанне. Вынікам працы стаўся ўдзел у свяце краіны "Славянскі вянок", за які наш беларускі фальклорны ансамбль быў узнагароджаны прызамі, а адзін з актыўных арганізатараў Ніна Савінава атрымала спецыяльную прэмію -- Беларускі культурны цэнтр, свой офіс у Рускім культурным цэнтры. Гэта каля 100 квадратных метраў.

І яшчэ адзін вынік гэтай працы -- новае спатканне, свята беларусаў, якое становіцца тут традыцыйным.

Самаахвярная праца заўсёды знаходзіць прыхільнікаў. У першую чаргу ім стала Міністэрства культуры ў асобе начальніка Упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці спадара Тадэвуша Стружэцкага, высокаадукаванага спецыяліста ў галіне культуры.

Гэта і з яго дапамогай адбыліся сёлета паездкі нашых мастацкіх калектываў у беларускія суполкі Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі. Ён разумее, якое вялікае свята для людзей, адарваных ад Беларусі, сустрэча з Радзімай. І гэтым разам ён, як і ў мінулым годзе, здолеў падрыхтаваць усё так, каб у людзей засталіся ўспаміны надоўга. Гэта і фальклорны ансамбль "Шчодрыца" (існуе, дарэчы, толькі адзін год, кіраўнік яго -- дэкан факультэта універсітэта культуры Валянціна Трамбіцкая), які так выдатна змог перадаць каларыт музыкі Палесся. Гэта і выстава-продаж вырабаў народных майстроў, якую прывезла дырэктар Цэнтра беларускіх народных рамёстваў Ірына Сініца. Роспіс, вырабы з саломкі, лазы, лёну, ткацтва, трыкатажныя вырабы — усё выклікала вялікую цікавасць і захапленне.

Але асаблівы поспех (як, дарэчы, і ўсюды, дзе бывала ў розных краінах свету) мела наш народны майстар пякарскай скульптуры Валянціна Уласік. Яе прыродны талент так змог рэалізавацца ў выпечцы, што нават цяжка ўявіць, як на адным вялізным каравai можна ўбачыць увесь вясельны беларускі абрад. Жаніх і нявеста, бацькі, музычны ансамбль, вавёрачкі (каб не круціліся), мядзведзі (каб былі здаровыя), птушкі (каб спявалі ўсё жыццё), і ўсё ў колеры. І вясельны каравай "Лебядзіная вернасць", які, дарэчы, на аўкцыёне купілі за 80 долараў.

Дапоўніў усё афармленне, канешне ж, гармонік. Іван Слізкі, працуючы перакладчыкам, піша музыку да вершаў І.Цітаўца (іх друкуе "Голас Радзімы"), гэта музыкант, што называецца, ад прыроды. Калі ён са сваім гармонікам сустракаў гледачоў у фае, людзі адразу пачыналі прытанцоўваць.

А вечар працягваўся. Са сцэны гучалі прывітанні: беларускага консула Івана Бондара, прадстаўніка Міністэрства культуры Эстоніі, старшыні Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Ганны Сурмач, суполак рускай, украінскай...

Добра знаёмыя нам БЭЗаўцы з Йыхві ўзялі значны ўдзел у праграме. Дзяўчаты спявалі песні, а беларускі паэт Валодзя Дзехцярук чытаў свае вершы. Прэзентацыя яго кнігі "Сярод белых эстонскіх начэй" была тыдзень назад, яе дапамагалі арганізоўваць і талінскія суполкі, і консульства, і мастакі суполкі "Маю гонар". Гэтая кніга заслугоўвае асаблівай увагі. Усе вершы яе пранізаны любоўю да Беларусі, успамінамі пра яе, трывогай за яе, сучасную і будучую, за лёс роднай мовы. Лёс паэта -- лёс многіх беларусаў, якія апынуліся па-за межамі Бацькаўшчыны. Зала ціхенька паўтарала за ім: "Беларусь! Ты далёка-далёка, не разблытаць жыццёвы клубок... я стаю, а па небе аблокі, быццам думкі, плывуць у твой бок".

Закончыўся вечар начным аглядам Таліна ва ўтульнай зале наверсе тэлевежы. Гарэлі свечкі, уздымаліся бакалы шампанскага. Тут унеслі свой фінансавы ўклад беларускія бізнесмены, якія былі побач з Савінавай пры правядзенні імпрэзаў. Дарэчы, яны вельмі адрозніваюцца ад нашых прадпрымальнікаў сваёй самастойнасцю, упэўненасцю ў сваім фінансавым становішчы, у будучыні, і падставы для гэтага ёсць. У Эстоніі створаны добрыя ўмовы для бізнесу -- гэта палітычная стабільнасць, грашовая рэформа пасля 1992 года, паслядоўная прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў у ходзе міжнародных прыватызацыйных тураў, нізкія падатковыя стаўкі, добрыя ўмовы наземнага, воднага, паветранага транспарту.

Складанае жыццё ў Эстоніі ва ўсіх, хто не ведае эстонскую мову. Але ж дзякуючы такім цудоўным мерапрыемствам, пазнаўшы бліжэй культуру іншых народаў, з якімі эстонцы жывуць побач, пабачыўшы, што гэты народ памятае сваю мову, культуру, гісторыю, пачынаюць ставіцца з павагай да іх, як гэта адбылося з беларусамі. Доўга яшчэ не хацелі разыходзіцца людзі. Адны размаўлялі і знаёміліся з тымі, хто прыехаў, другія набывалі сувеніры, а кіраўнікі беларускіх суполак падводзілі вынікі сваёй працы і абмяркоўвалі планы на будучыню.

Ніна ПЕТУХОВА.

НА ЗДЫМКАХ: фальклорны гурт "Шчодрыца" Мінскага дома настаўніка на вечарыне "Спатканне".

КАЛІНОЎСКІ І БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

Але па сутнасці ў той або іншай ступені нацыянальная ідэя, яе зародкі, прысутнічае ў дзейнасці і творчасці ці не кожнага беларускага дзеяча XIX стагоддзя, кожнага, хто браў у рукі беларускую ліру, пачынаў збіраць нацыянальныя памяткі, задумваўся пра месца беларусаў сярод народаў свету, -- Я.Баршчэўскага, М.Баброўскага, Я.Чачота, П.Шпілеўскага, А.Кіркора, А.Вярыгі-Дарэўскага, ужо не кажучы пра такога буйнога пісьменніка, як В.Дунін-Марцінкевіч. У сувязі з гэтым не магу пагадзіцца з думкай маладога даследчыка А.Латышонка, выказанай не так даўно ў артыкуле "Беларуская нацыянальная ідэя" (час. "Сьвіцязь", 1994, N 2): "В.Дунін-Марцінкевіч быў БЕЛАРУСКІМ паэтам, але не быў беларускім НАЦЫЯНАЛЬНЫМ паэтам..." Ці не штучным, надуманым з'яўляецца гэтае супрацьпастаўленне? Як можна сцвярджаць такое, калі Дунін-Марцінкевіч -- для гісторыкаў культуры гэта відавочна -- цэлая эпоха ў мастацкім развіцці беларускага народа? Больш слушнай здаецца формула акадэміка І.Навуменкі ў яго нядаўняй манаграфіі пра аўтара "Гапона" і "Пінскай шляхты": "Ён быў беларускім пісьменнікам, і гэтым усё сказана. Ён ганарыўся сваёй іменна беларускай вядомасцю і свядомасцю".

Надзвычай важным гістарычным звяном у працэсе кансалідацыі беларускай нацыі і выпрацоўкі нацыянальнай ідэі бачыцца нам і Кастусь Каліноўскі.

Быць можа, няпроста адшукаць у яго на гэты конт адну прамую ёмістую формулу. Хіба ў паролі віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі, на чале якой стаяў Каліноўскі: "Каго любіш? -- Люблю Беларусь. -- Так узаемна!" Або ў апошнім звароце да роднага народа з-пад царскай вісельні: "... цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную" (цытуем паводле аўтографа, знойдзенага Уладзімірам Казберуком у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве). З кантэксту як гэтага выказвання, так і ўсёй творчасці Каліноўскага відаць, што пад "чалавечым і народным правам" ён мае на ўвазе сацыяльныя і нацыянальныя правы свайго народа. І, зразумела ж, усё гэта вельмі блізка да формулы нацыянальнай ідэі, як яна прагучыць трохі пазней у нашаніўскі перыяд -- людзьмі звацца, звацца беларусамі.

З другога боку, у творчасці і дзейнасці Каліноўскага без цяжкасці знаходзім усе неабходныя элементы-чыннікі, з якіх гэтая ідэя складваецца.

Па-першае, Каліноўскі сам быў носьбітам народнай культуры, увасабленнем лепшых рысаў нацыянальнага характару, ён па-сыноўску ведаў і любіў родную беларускую мову, віртуозна карыстаўся ёю ў сваёй творчасці, рабіў усё магчымае для пашырэння сферы яе ўжывання. Сваёй "Мужыцкай праўдай", "Пісьмамі з-пад шыбеніцы" ён не толькі даказваў наяўнасць сярод народаў свету беларусаў, не толькі выказаў іх сацыяльныя і нацыянальныя памкненні, як яны бачыліся ў эпоху падзення прыгонніцтва, але і ўнёс значны, адметны ўклад у станаўленне новай беларускай літаратуры, у выпрацоўку беларускай літаратурнай мовы новага часу. Ужо пасля вынясення смяротнага прысуду ён піша ў турме развітальны верш да нявесты Марыі Ямант. Надзвычай характэрная рэч -- верш гэты таксама напісаны па-беларуску. Які яшчэ патрэбны доказ таго, што адносіны Каліноўскага да беларускай мовы -- гэта не адносіны нейкага палітычнага разліку, а самыя натуральныя і арганічныя. Ён пастаянна выпраменьваў і ствараў вакол сябе беларускую аўру. І не згубіў гэтай якасці нават у часіну смяротнага выпрабавання.

У наш складаны час пад маркай барацьбы за "гістарычную ісціну" робяцца спробы паставіць пад сумненне сувязь Каліноўскага з беларускім народам, значэнне выдатнага змагара ў выпрацоўцы беларускай нацыянальнай ідэі. Той-сёй гаворыць (спашлёмся на "ЛіМ" ад 7.12.1990), што ў "Мужыцкай праўдзе" ні разу не называюцца беларусы, Беларусь. Гэта праўда, там паўсюль фігуруюць, здавалася б, не акрэсленыя ў нацыянальных адносінах "дзецюкі", але ці можна рабіць адсюль вывад, што Каліноўскі быццам бы не бачыў самабытнасці беларускага народа, не дапускаў магчымасці, што беларусы могуць жыць самастойна, не ставіў пытання аб навучанні на беларускай мове і г.д.? Памылковасць падобнай думкі давесці зусім не цяжка. Ад імя беларусаў Каліноўскі зусім пэўна выступае ў "Пісьмах з-пад шыбеніцы". Успомнім пачатак гэтага выдатнага твора: "І да нашага кутка даляцела ваша Газэтка, і мы яе з увагай прачыталі, вельмі яна ўсім спадабалася, бо праўда напісана. Прыймеце для тага на[illegible] адзяку, а пісьмо аддрукуйце, каб знаў свет Божы, як мужыкі Беларусы глядзяць на маскалёў і паўстанне польскае, чаго яны хочуць і чаго па сваёй сіле дабівацісь будуць". Ёсць у "Пісьмах з-пад шыбеніцы" і такія радкі, дзе параўноўваюцца пазіцыі польскіх паўстанцаў ("ронд польскі") і расійскага царызму (які часам пазначаўся ў тэкстах Каліноўскага словамі "маскаль", "Масква", хаця значэнне іх гэтым не абмяжоўвалася) у нацыянальным пытанні: "Калі ронд польскі ўсім братнім народам дае самарондства, маскаль мала таго, што гэтак не робіць, но яшчэ там, гдзе жылі палякі, літоўцы і беларусы, заводзіць маскоўскія школы, а ў гэтых школах учаць па-маскоўску, гдзе ніколі не пачуеш і слова па-польску, па-літоўску да па-беларуску, як народ таго хоча..." Як бачым, тут ставіцца пытанне не толькі пра навучанне на роднай мове, але і пра "самарондства" беларусаў, як і літоўцаў. Надзвычай цікавы наватвор Каліноўскага "самарондства" заключае ў сабе цэлую канцэпцыю: яго можна разумець не толькі ў вузкім сэнсе, як самакіраванне, але і шырэй -- як прызнанне і патрабаванне суверэннасці народаў, што ўваходзілі ў колішнюю Рэч Паспалітую. Тое, што А.Герцэн на лонданскіх перагаворах з прадстаўнікамі варшаўскага ЦНК называў "самозаконностью провинций". (Зазначым у дужках, што ў 20-я гады, на новай хвалі нацыянальнага адраджэння, нашы лінгвісты сканструявалі вельмі блізкі да слова Каліноўскага наватвор "самаўрад" са значэннем "аўтаномія, самакіраванне", і гэта яшчэ раз пацвярджае як палітычнае, так і філалагічнае чуццё "атамана мужыцкай праўды"). Тыя ж надзвычай важныя, прынцыповыя палажэнні, што і ў "Пісьмах з-пад шыбеніцы", знаходзім і ў інспіраванай Каліноўскім газеце "Глос з Літвы", якая выходзіла за межамі краю ў Кёнігсбергу (дарэчы, для гэтай жа газеты прызначаліся і "Пісьмы з-пад шыбеніцы", прынамсі, першая іх, самая вялікая, частка). Звернем увагу на наступны тэкст у N 4 газеты ад 20 сакавіка 1864 года (перакладаем з польскай): "Раўнапраўе народнасцей, станаў, вызнанняў — гэта імкненне, заключанае ў глыбіні сэрца ўсяго люду, імкненне моцнае, якое зрабілася моцнай воляй. Пад маскоўскім панаваннем гэтае імкненне і моцная воля наша не можа быць спатолена... Масква праследуе мову польскую, беларускую, маларускую, літоўскую і навязвае маскоўскую; мы хочам, каб кожная мова развівалася паводле ўласнай жыццяздольнасці: і літоўская, і беларуская, і маларуская, і польская".

Уладзімір Калеснік у сваёй багатай на думкі і канцэптуальныя палажэнні кнізе "Тварэнне легенды" справядліва адзначыў, што Каліноўскі першы назваў беларусаў народам. Прынамсі першы ён зірнуў на беларусаў як на суб'ект самастойнага гістарычнага дзеяння. Адносіны Каліноўскага да беларускага народа нейкія інтымныя, вельмі душэўныя і свойскія. Можна сказаць, ён ставіўся да беларускага народа як да нейкай блізкай яго сэрцу жывой і нібыта роўнай яму істоты. Нязмушанае "народзе" або нават з пачцівай вялікай літары "Народзе" (як уласнае імя) -- адно з любімых слоў Каліноўсага. А то ён мог сказаць пяшчотна: "Мой дарагі народзе". І нават патэтычна: "ты, народзе вялікі і чэсны" (усе цытаты з "Пісьмаў з-пад шыбеніцы"). У апошнім выпадку ён нібы падсвядома пераносіў на беларусаў, на ўвесь народ, якасці, у высокай ступені характэрныя і для яго самога. Ды па сутнасці кожны заўсёды мерае той мерай, на якую здольны.

Каліноўскі бачыў пераважна сялянскі характар беларускага народа, беларускай нацыі тых часоў, як бачыў гэта трохі пазней і Я.Купала, які пісаў у адным з артыкулаў 1919 года пра сумныя вынікі паланізацыі роднага краю: "Масы, народ земляробны, асталіся беларусамі, а іх баярства, вышэйшыя станы сталіся палякамі" (Купала Я. "Жыве Беларусь". Мн., 1993, с. 306). Так і Каліноўскі называў беларусаў "мужыцкім народам" ("Бывай здаровы, мужыцкі народзе..."). У гэтым кантэксце прачытваецца (прынамсі, можа прачытвацца) і выраз "мужыкі Беларусы" з прыведзенага ўжо пачатку развітальных "Пісьмаў...".

Беларуская нацыянальная ідэя заключалася ўжо ў самой рэвалюцыйна-дэмакратычнай стратэгіі Каліноўскага. Паслядоўны радыкал, ён -- прынамсі ў тэорыі -- скідваў з гістарычнай сцэны дваранства, шляхту, "баярства" (калі ўжыць выраз Я.Купалы).

Генадзь КІСЯЛЁЎ.

(Працяг будзе).

КАЗІМІР СТАБРОЎСКІ – МАСТАК, ПЕДАГОГ І АРТЫСТ З НАВАГРУДЧЫНЫ

СІМФОНІЯ Ў ФАРБАХ

Імя яго ў Беларусі незаслужана забыта. Ды й напісана пра яго зусім-зусім мала. Хіба толькі ў кнізе Л.Дробава "Живопись Белоруссии XIX -- начала XX в.", дзе сам аўтар адзначае, што "в белорусской искусствоведческой литературе о К.Стабровском упоминаний нет".

Наогул, род Стаброўскіх даволі таленавіты і на Беларусі знакаміты. Адсюль выйшаў, напрыклад, археолаг, краязнаўца, гісторык, філосаф, вынаходнік, заснавальнік аднаго са старэйшых у рэспубліцы Слонімскага краязнаўчага музея Іосіф Стаброўскі. Дзед яго Вікенці Стаброўскі быў земскім рэгентам, гаспадаром маёнтка Кулікі, за свае сродкі пабудаваў уніяцкую царкву ў Мілавідах. Маці Іосіфа Стаброўскага Людвіка была родам з князёў Масальскіх. Яе бацька Адольф Масальскі прымаў актыўны ўдзел у паўстанні 1863 года. За гэта Мураўёў-вешальнік саслаў яго ў нерчынскія руднікі. І родны брат маці Стаброўскага Карп Масальскі таксама ўдзельнічаў у гэтым паўстанні. Ён з'яўляўся камандзірам аднаго з атрадаў Кастуся Каліноўскага. Яго схапілі, пасадзілі ў клетку і вазілі па вуліцах Слоніма, а пасля расстралялі...

Што датычыць Казіміра Стаброўскага, дык ён быў стрыечным братам Іосіфа Стаброўскага. У свой час ён славіўся сваёй вядомасцю на ўсю Беларусь, Польшчу і Расію як мастак, артыст і педагог.

Нарадзіўся Казімір Стаброўскі ў маёнтку Крупляны на Навагрудчыне ў сям'і вайскоўца. Пасля заканчэння Беластоцкага рэальнага вучылішча паступіў у Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. Вучыўся сем гадоў з невялікімі, але частымі перапынкамі. З-за хваробы вачэй прыязджаў дамоў, каб падлячыцца. У апошнія гады вучобы займаўся ў майстэрні І.Рэпіна.

Пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў Казімір Стаброўскі працягваў вучобу ў Акадэміі Жуліяна ў Парыжы.

У канцы 1894 года наш зямляк вяртаецца на Навагрудчыну, дзе доўгі час жыве і працуе. Як вядомы ўжо і вопытны мастак, ён пачынае ўдзельнічаць у мастацкіх выставах у Пецярбургу, Парыжы, Мюнхене, Венецыі. За карціну "Цішыня вёскі" ў 1900 годзе ў Парыжы на міжнароднай выставе Казімір Стаброўскі атрымаў сярэбраны медаль. Яго карціна "Ля раз'езда" была набыта для музея ў Мюнхене, а "Лазенкаўскі парк у Варшаве" -- для Венецыянскай нацыянальнай галерэі.

Казімір Стаброўскі марыў адкрыць сваю школу прыгожых мастацтваў. І яго мара збылася. У 1904 годзе на сродкі, якія былі сабраны за кошт асабістых ахвяраванняў, у Варшаве ён адкрывае Школу прыгожых мастацтваў. На працягу шасці гадоў наш зямляк быў яе дырэктарам і выкладчыкам. Гэтая школа на той час лічылася лепшай навучальнай установай Варшавы. Выкладанне ў ёй вялося на вышэйшым прафесійным узроўні. На еўрапейскіх выставах працы вучняў Казіміра Стаброўскага заўсёды адзначаліся прэміямі. Сярод іх нямала было беларусаў.

У 1912 годзе наш жывапісец і педагог пакідае Варшаву і поўнасцю аддаецца мастацкай творчасці. Ён пачынае падарожнічаць па свеце. Быў у Турцыі, Грэцыі, Егіпце, Іспаніі, Італіі, Швецыі і многіх іншых краінах. З падарожжаў К.Стаброўскі заўсёды прывозіў новыя свае карціны, большасць якіх вылучалася лірычнасцю вобразнага ладу і пяшчотным каларытам.

У гэты час мастак пачынае працу над славутай серыяй з адзінаццаці карцін "Шэсце навальніцы". Сам Казімір Стаброўскі тлумачыў, што ён ужо тады прадбачыў у сваіх карцінах першую сусветную вайну, якая прынясе шмат гора і бяды на беларускую зямлю.

"Шэсце навальніцы" распадаецца на некалькі карцін, з якіх кожная ўяўляе сабой самастойную "сімфонію ў фарбах". Уласцівая творчасці Казіміра Стаброўскага прыгожая і змястоўная сімволіка пранікае ў іх і надае ім характар паэтычных твораў, у якіх змест пераважае над формай. Усяму цыклу, за выключэннем апошняй светлай і радаснай карціны, уласцівы змрочны, з прыцемкам тон, што таксама характэрна для твораў Стаброўскага.

Шэсце навальніцы... Над ціхімі беларускімі палямі збіраюцца змрочныя хмары. Сонца схавалася, у хмарах заклубіліся злавесныя вобразы, і той, каму дадзена гэта бачыць, заўважае ў іх злосныя пачатак, які прыняў формы дзікіх звяроў і пачвар. А да ўрагану, які нясецца над безабароннай і змрочнай краінай, працягнуліся чыесьці ўчэпістыя кіпцюрастыя лапы,.. і з гучным карканнем ляцяць прадвеснікі навальніцы і чорныя груганы няшчасця.

[illegible]сь грымнуў пярун. І на м[illegible]ьных узгорках сталі бясконцымі чародамі маўклівыя крыжы. Цэлы лес крыжоў --Галгофа ўсяго беларускага народа. А ў хмарах зноў паказаліся драпежн[illegible]орныя лапы страшнай пачв[illegible] асветленыя маланкай.

І[illegible]лаюць вёскі і гарады Беларусі. І гінуць у полымі народныя скарбы, палацы і хаты. Запалалі помнікі даўніны, запунсавела зарывам неба над старажытным багатым горадам, і паплылі жудасныя цені па вуліцах і завулках. А ў воблаках дыму ўюцца страшныя змеі. Гэта трыумфуюць сілы зла, якія сарваліся з ланцуга пад навальнічнай віхурай.

[Заканчэнне на 8-й стар.].

З КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

СПАСЦІГАЮЧЫ ТАЯМНІЦУ БЫЦЦЯ

Так рэдка апошнім часам з'яўляецца жаданне пасля выхаду новага твора сучаснага аўтара пагаварыць пра кнігу. Можа таму, што няма больш сіл абмяркоўваць і заглыбляцца ў змрочныя гады рэпрэсій, станавіцца ці то саўдзельнікам, ці то абвінаваўцам нечых злачынстваў -- забойстваў, крадзяжаў, махлярства. "Святло загадкі" Алы Сямёнавай -- спроба спасцігнуць таямніцу быцця, яна пра чысціню і высакароднасць, пра станаўленне і духоўнае ўзмужненне асобы. Дзякуючы выдавецтву "Радыёла", імпрэсіі і адлюстраванні А.Сямёнавай, як вызначае жанр свайго твора пісьменніца, у мінулым годзе выйшлі ў свет. На жаль, вельмі мізэрным тыражом. Аўтар прысвячае кнігу сваім землякам, людзям Навагрудчыны, да якіх я прылічваю і сябе. І таму, мусіць, усё напісанае ўспрымаю асабліва востра, нібы чытаю пра сябе саму.

Я не магу адасобіцца, не суперажываць, калі чытаю пра вяртанне з высылкі Данінай сям'і, бо штосьці падобнае перажыла сама. Яе школа, яе настаўнікі былі і маімі, і дзіцячыя справы, якія сёння падаюцца нязначнымі, былі сэнсам нашага тагачаснага існавання. З адлегласці часу многае бачыцца па-іншаму. Памятаю, як, прыехаўшы праз дзесяць гадоў у родную школу, была здзіўлена яе вузкімі калідорамі: [illegible]пісьці яны мне такімі не бачь[illegible]

Моладзь 50-х верыла у [illegible]абро і высокія ідэалы. Мы былі наіўнымі і гатовымі, як і нашы зусім нядаўнія папярэднікі, аддаць жыццё за гэтыя ідэалы. Але і тады былі кашто[illegible]часці, што не становяцца м[illegible]мі і праз дзесяцігоддзі. Веч[illegible]м застаецца перш за ўсё сам Навагрудак. Любоў да яго гераіня "Загадкі" пранесла праз гады, зведваючы на сваім лёсе яго ўплыў, несучы яго пячатку. У такіх выдатных месцах пачуццё нацыянальнай годнасці выхоўваецца неяк само сабой, бо немагчыма дзень пры дні, дакранаючыся да гісторыі, не зацікавіцца ёю. Тут ведаюць, што Навагрудак быў старажытнай сталіцай беларускай дзяржавы, жывыя згадкі пра Міндоўга, Ягайлу... Мы выраслі на руінах замка. Ён для нас сімвал не толькі былой магутнасці дзяржавы, але і нашага шчаслівага юнацтва.

Мы не былі разбэшчаны тэлебачаннем, яшчэ не апанавала маладыя істоты лянота думкі. Таму неад'емнай часткай таго жыцця былі кнігі. Яны выхоўвалі нас, вучылі, прыносілі асалоду. Любімай парой былі канікулы, калі чытаць можна было, пакуль хапала сіл.

"Святло загадкі" знайшло сваіх чытачоў сярод розных пакаленняў. Чытаючы кнігу, моладзь мае магчымасць скласці ўяўленне пра тое, як тады было. Старэйшыя нібы вяртаюцца ў мінулае, згадваючы сваю маладосць з усім дадатным і адмоўным.

Пад агульнай вокладкай у кніжцы змешчаны і яшчэ адзін твор -- "Бэзавы попел" (дарэчы, у задуме аўтара было выдаць трыпціх: "Святло загадкі", "Бэзавы попел" і "Птушка Фенікс"). Па словах А.Сямёнавай, "сюжэтна творы ніяк не залежны". Я думаю, што ўсе яны "залежны", звязаны асобай аўтара ў розныя перыяды яго жыцця, дзе паўстае чалавекам, які мае свой свет, як сказаў пра Алу Сямёнаву Міхась Стральцоў. Гэта пра яго, паэта і чалавека, "Бэзавы попел" -- эпісталярна-прывідны ўспамін.

Дзіяна ЧАРКАСАВА.

"АРТ-ФІТА-95"



Напярэдадні Новага года ў музычнай гасцінай у Віцебску адкрылася унікальная выстава "Арт-фіта-95". Яе аўтары -- мастакі-керамісты Ігар Вараб'ёў, Андрэй і Павел Навічэнкі, мастачка па тканіне Алена Яснова -- прадставілі на суд гледачоў сапраўдныя шэдэўры сусветнага мастацтва. А ўпрыгожылі іх работы экзатычныя расліны з прыватнай калекцыі Аляксандра Янучкіна і Ігара Балобава, а таксама з Батанічнага сада Віцебскага дзяржуніверсітэта.

НА ЗДЫМКАХ: мастакі Павел НАВІЧЭНКА, Ігар ВАРАБ'ЁЎ, Алена ЯСНОВА, Андрэй НАВІЧЭНКА, Аляксандр ЯНАЧКІН; работа А.ЯСНОВАЙ "Нацюрморт з вішнямі"; сумесная праца аўтараў выставы "Арт-фіта-95".

Фота Аляксандра ХІТРОВА.

І БЫЛО НАВАГОДНЯЕ СВЯТА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

Радаваліся людзі і цешылі сябе кволай надзеяй: а можа хоць крыху стане лягчэй у новым годзе! Нягледзячы на сцюжу і траскучыя маразы, вабілі да сябе вуліцы, паркі і плошчы сталіцы, дзе зіхацелі ў навагоднім убранстве ёлкі, дзе адбываліся святочныя прадстаўленні мастацкіх калектываў.

Гэта цяпер пацяклі будні.

А спачатку было свята. Такім яго ўбачыў у Мінску наш фотакарэспандэнт Віктар СТАВЕР.

Яўген ГУЧОК

"ЗАЎЖДЫ МЫ ХІЛІМСЯ..."

***

Маўчанне наша
Агучванню не паддаецца,
Бо ў ім няма нічога.

***

Уся наша вастрыня у тым,
Што бьщцам на калку сядзім мы
Вострым.

***

А тонкасць наша --
Ні больш-ні менш,
Як цэлафанавая тонкасць.

***

"Звышсціпласць"
наша дазваляе
Не нам, а іншым
Для нас дарогі выбіраць.

***

Наперад на карачках
мы ідзем,
Назад жа --
На злом галоў імчымся.

***

І мы, нібыта ў хованкі,
Прыйшлі гуляць
У гэты свет.

***

Няхай мы -- толькі абалонка,
Але ж бяда, што і
ўнутры яе --
Нічога.

***

Шукаем адзінакроўства --
Адзінаглупства
Знаходзім.

***

Кожны хоча, каб колер свой
Распаўсюдзіць на нас,
А мы падстаўляемся.

***

А яшчэ радаслоўная наша
ад тых,
Хто на ўласны
нават шнурок
Наступае.

***

Хто дазваляе вочы
завязаць сабе,
Таму падвяжуць хутка
Й падбародак.

***

У свой час мы
язык прыкусілі,
Ды так, што родную мову
Навек заняло.

***

Ні да Бога,
Ні да волі
Цягі мы пакуль не маем.

***

І ў нас ёсць німб;
Ён, праўда, вакол шыі,
Імя ж яму -- хамут.

***

А гэта талерантнасць --
Дык проста здольнасць
Талеркі
за чужынцамі вылізваць

***

Так, так, мы, можа, й адцвілі
І можа, плод у завязь
Не узяўся.

СІМФОНІЯ Ў ФАРБАХ

(Заканчэнне.
Пачатак на 7-й стар.).

І наступіць пара, калі над гаротнай краінай, над руінамі і крыжамі панясуцца пад аблокі душы няшчасных пакутнікаў, а высока ў небе з'явіцца распятая на крыжы Справядлівасць, і цень ад яе крыжа працягнецца па ўсёй краіне. А яна, засмучаная і знявечаная ворагамі, будзе ахінутая гэтым страшным ценем, і, куды ні працягнецца ён, усюды стануць чорнымі спаленыя мястэчкі, гарады і вёскі.

Знявечаны сам твар беларускай зямлі. Высечаны векавыя лясы, толькі пні засталіся навокал, ды ўзвышаюцца то тут, то там маўклівыя курганы. Пуста на зямлі. Але затое там, уверсе, пануе таемнае жыццё: зборышча ўкленчаных просіць у неба выратавання ад прыгнёту бязлітасных цёмных сіл.

І ўзнімаецца благаславёны палец, і цёмныя курганы на апусцелай зямлі прыслухоўваюцца і да малення, і да благаславення.

Але над мёртвай, а можа быць, толькі заснуўшай краінай хутка прагучыць першы заклік да вызвалення. Прачнуцца тыя, хто спаў, уваскрэснуць мёртвыя, і мільёны палымяных віцязяў з крыламі на залатых латах панясуцца на конях у апошнюю бітву з цёмнымі і злымі сіламі. Гімн абуджэння зменіцца грознай рапсодыяй нябачнай бітвы. Злыя сілы будуць пераможаны народам, навальніца пройдзе, і над вызваленай і шчаслівай краінай заззяе вясёлка новага жыцця.

Такое тлумачэнне сваім карцінам даваў сам мастак. Казімір Стаброўскі, відаць, прадбачыў не толькі першую сусветную вайну, але і другую, а таксама чарнобыльскую бяду, якія ператварылі і ператвараюць Беларусь у сапраўдную галгофу беларускага народа.

Усё ж жах і шэсце першай сусветнай вайны мастак добра адчуў на сабе. Яго маёнтак у Крупленах быў разгромлены немцамі, а сам таленавіты жывапісец стаў бежанцам, прыхапіўшы з сабою некалькі дзесяткаў сваіх карцін. Ён пры[illegible]ў у Петраград, дзе наладзіў у Таварыстве падтрымкі мастацтваў выставу сваіх прац. Пасля яе заканчэння пераехаў у Маскву. Тут у залах мастацкага салона на Вялікай Дзмітраўцы зноў арганізаваў выставу сваіх карцін, якая зрабіла вялікае ўражанне на мастацкую грамадскасць Масквы. Перадавыя рускія мастакі В.Бяклемішаў, І.Рэпін, В.Матэ і іншыя ўнеслі прапанову на разгляд савета Расійскай акадэміі мастацтваў аб наданні Казіміру Стаброўскаму звання акадэміка жывапісу. Адбылося галасаванне: 16 чалавек прагаласавалі "за", а 19 -- "супраць". Ды не ў гэтым справа, а справа ў тым, што творчасць нашага земляка ўжо тады мела вялікую сілу і папулярнасць...

Казімір Стаброўскі быў не толькі мастаком, вучоным і педагогам, але і артыстам. Ён меў нават ступень артыста першай катэгорыі, выступаў на сцэнах многіх тэатраў.

Пражыў наш зямляк крыху больш за пяцьдзесят гадоў. Памёр ад інфаркту ў 1929 годзе. Газета "Кур'ер Варшаўскі" 10 чэрвеня 1929 года пісала: "Памёр вядомы чалавек, знакаміты артыст, энтузіяст усяго прыгожага, слынны арганізатар і філосаф Казімір Стаброўскі... Гэта быў чалавек вялікай працы".

Сапраўды, Казімір Стаброўскі працаваў шмат і пакінуў пасля сябе багатую спадчыну. На жаль, творы яго раскіданы па свеце. Нават цяжка ўявіць, што праз месяц ці праз год, ці праз дзесяць гадоў надарыцца магчымасць наладзіць на яго радзіме -- роднай Беларусі ці Навагрудчыне выставу ягоных карцін. Але верыцца ў гэта. І калі каму пашанцуе пабываць у мастацкіх музеях Польшчы, Германіі, Італіі, Расіі, вы сустрэнецеся з карцінамі нашага славутага земляка Казіміра Стаброўскага. Яны вас прыцягнуць маркотнымі вясковымі краявідамі Беларусі, міфалагічнымі вобразамі, драмай і містыкай.

Сяргей ЧЫГРЫН.

РАДАСЦЬ МАЯ ЯСНАВОКАЯ

Словы І. ЦІТАЎЦА *Музыка* М. СЛІЗКАГА

Помніш, калі мы спаткаліся,
Музыка пела навокала.
Ты, нібы зорачка з неба, з'явілася,
Радасць мая яснавокая.

З часу таго незабыўнага
Знікла жыццё адзінокае.
Побач з табою яно закружылася,
Радасць мая яснавокая.

Нашы спатканні гарачыя
Сталі зарніцай далёкаю.
Ты мне ўсё любая, ты мне ўсё мілая,
Радасць мая яснавокая.

Ты, як бярозанька стройная,
Крочыш паходкаю лёгкаю.
Толькі з табою на сэрцы спакойна мне,
Радасць мая яснавокая.

Рэдактар Вацлаў МАЦКЕВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІК:

Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (таварыства "Радзіма").



НАШ АДРАС:

220005, МІНСК, ПРАСПЕКТ
Ф. СКАРЫНЫ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80,
33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Пазіцыя рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", не заўсёды супадаюць.

Газета набрана і звярстана ў камп'ютэрным цэнтры рэдакцыі газеты "Вечерний Минск".
Аддрукавана ў друкарні "Беларускі Дом друку".
(220041, г. Мінск, пр. Скарыны,77).
Тыраж 3 000 экз. Індэкс 63854. Зак. 32.
Падпісана да друку 8.1.1996 г.